Цітоў К.

# ДВОЙЧЫ ЗАГІНУЎШЫ

Імя камандзіра роты 986-га стралковага палка 230-й стралковай дывізіі 5-й ударнай арміі 1-га Беларускага фронту, Героя Савецкага Саюза Івана Пракопавіча Гаманкова, на жаль, у нас амаль не вядома. Між тым, яшчэ ў чэрвені 1967 года ў раённай газеце "Ленінскі кліч" быў змешчаны матэрыял настауніка Наркоўскай школы І Ткачова "Герой Гаманкоў – наш зямляк". У ім апавядалася: "І. П. Гаманкоў – наш зямляк. Яго бацька жыў у вёсцы Камароўка (цяпер калгас "Камунар"). Там нарадзіўся і Іван Пракопавіч... З Камароўкі бацькі пераехалі ў вёску Яўкіна Шумяцкага раёна. Там, на Смаленшчыне, і правёў свае юнацкія гады Іван Гаманкоў". Валодаў звесткамі аб мужным земляку і наш вядомы краязнаўца М. Мельнікаў. У гісторыка-эканамічным нарысе "Крычаў. Гарады Беларусі" ён пісаў: "...Іван Пракопавіч Гаманкоў вучыўся у Крычаўскай чыгуначнай школе" (ст. 58).

А вось энцыклапедычныя звесткі чамусьці распавядаюць инакш, "Гаманкоў Іван Пракопавіч (27.02.1919 – 08.11.1980) – Герой Савецкага Саюза. Нарадзіўся ў вёсцы Яўкіна Клімавіцкага павета Магілёўскай губерні, зараз Шумяцкага раёна Смаленскай вобласці ў сялянскай сям’і. Рускі. У радах КПСС з 1949 года. У 1937 годзе скончыў Канстанцінаўскі шкляны тэхнікум у Данецкай вобласці. Працаваў у горадзе Арцёмаўску на шкляным заводзе. У 1938 годзе быў прызваны ў Чырвоную Армію. У 1939 годзе скончыў Маскоўскае ваенна-тэхнічнае вучылішча НКУС імя В. Мянжынскага, Тэхнік-інтэндант 2-га ранга Гаманкоў быў накіраваны для праходжання службы ў 87-ы Ламжанскі пагранічны атрад, які ў той час знаходзіўся ў г. Ломжа Беластоцкай вобласці БССР. 19 чэрвеня 1941 года пераведзены намеснікам камандзіра па забеспячэнні асобнай сапёрнай роты пагранічных войск НКУС Беларускай ССР".

У складзе гэтай роты І. Гаманкоў прыняў першы бой з нямецкімі акупантамі на Нёмане ў раёне Гродна. Пазней Іван Пракопавіч успамінаў: "Той крывавы світанак 22 чэрвеня 1941 года я сустрэў на беразе Нёмана. Тут і адбылася мая першая сустрэча з фашыстамі. Не ведаў я ў тыя хвіліны – правакацыя гэта альбо на нас ішла вайна. Але ўзвод свой падрыхтаваў да бою. Фрыцы плылі праз Нёман на лодках. Вясёла так плылі, нават хтосьці на губным гармоніку граў. Размаўлялі, гучна смяяліся, нібыта на пагулянку выправіліся. Але ніводная з тых першых лодак да нашага берага не дайшла. Дружна ўдарылі кулямётчыкі. Дзве лодкі перакуліліся, на іншых спешна запрацавалі вёсламі ў адваротным накірунку. Але праз невялікі перапынак – новая хваля. Сустракаем чужынцаў залпавым агнём. Але страляюць з лодак і з таго боку. Перастрэлка завязалася жудасная. Байцы мае змагаліся мужна. Але ж ворагаў было – цьма, ледзь паспявалі адбівацца. Гадзіны

чатыры трымалася застава. Шмат пагранічнікаў тут, ля Нёмана, склалі свае галовы, але не здаліся. Параненыя заставаліся ў страі. І толькі адна думка ў галаве: "Хлусіш, не возьмеш! Паглядзім, хто будзе смяяцца апошні...". Зараз, аднак, іхняя ўзяла. Кулі патрапілі ў маю правую нагу. Няўжо адваяваўся? Быў дадзены загад аб адыходзе. Мяне запхалі ў машыну з параненымі, а побач ірванула бомба... У хуткім часе маці на маёй роднай Смаленшчыне атрымала "пахавальную": "Ваш сын Гаманкоў І. П. загінуў смерцю храбрых пры абароне нашай Радзімы...". Але ніхто не ведаў, што крыху раней за бамбёжку, прадбачачы небяспеку, параненыя, дапамагаючы адзін аднаму, пакінулі санітарную машыну і схаваліся ў прыдарожнай канаве. Яны засталіся жывыя і зараз выходзілі да сваіх са зброяй у руках. Каля чыгуначнай станцыі Масты група пагранічнікаў сутыкнулася з нямецкімі дыверсантамі, пераапранутымі ў чырвонаармейскую форму. Цудам застаўся ў жывых пасля расстрэлу".

Паранены Іван Гаманкоў і некалькі байцоў ляснымі сцяжынкамі цераз балоты ўсё ж такі выйшлі да сваіх. Падлячыўся – і зноў у строй. Пасля спецправеркі ў аддзеле "Смерш", у снежні 1941 года, быў перакінуты праз лінію фронта да партызан, дзе былі патрэбны вопытныя камандзіры. Да верасня 1943 года змагаўся з акупантамі ў адной з партызанскіх брыгад у родных мясцінах. Пасля вызвалення тэрыторыі ад захопнікаў вярнуўся у склад дзеючай арміі. Вызваляў Беларусь. На рацэ Проня атрымаў другое раненне. Неўзабаве вярнуўся ў строй, камандаваў стралковай ротай. З баямі дайшоў да Германіі. На Одэрскім плацдарме атрымаў чарговае раненне. Хтосьці паспешліва зрабіў выснову: "Смяротнае!" І родным адправілі ўжо другую па ліку "пахавальную".

Але ж Іван Гаманкоў выжыў. Вярнуўся пасля шпіталю ў сваю роту і выйшаў з ёю на бераг Шпрэе. 24 красавіка 1945 года капітан Гаманкоў – камандзір роты 986-га стралковага палка 230-й стралковай дывізіі, у баі за Берлін, падчас фарсіравання Шпрэе пераправіўся са сваім падраздзяленнем на процілеглы бок і захапіў апорны пункт праціўніка. Яго рота знішчыла 12 гармат, 6 кулямётаў, 3 мінамёты і больш за 120 чалавек жывой сілы праціўніка. Атрымаўшы цяжкае раненне, ротны працягваў кіраваць сваім падраздзяленнем.

31 мая 1945 года Указам Прэзідыума Вярхоўнага Савета СССР капітану І. П. Гаманкову за мужнасць і адвагу, праяўленыя ў бітве за Берлін, было прысвоена званне Героя Савецкага Саюза (узнагарода № 8774). Пра гэта Іван Пракопавіч даведаўся з газеты "Правда", якая трапіла яму ў рукі ў шпіталі ў горадзе Познань. "Усю вайну шукала мяне смертачка, ды так і не знайшла, – расказваў Іван Пракопавіч. – Відаць, памятала тыя словы: "Хлусіш, не возьмеш!", што былі сказаныя тым ранкам на беразе Нёмана. І не ўзяла-такі! А наконт смеху – тут усё зразумела. Канчатковая перамога засталася за намі!"

Пасля вайны І. Гаманкоў звольніўся ў запас. Грудзі былога афіцэра ўпрыгожвалі, акрамя залатой зоркі Героя, баявыя ўзнагароды – ордэны

Леніна, Чырвонай Зоркі, Айчыннай вайны I ступені, медалі. У 1951 годзе ён скончыў Вышэйшую школу прафсаюзнага руху. Жыў у Маскве, быў на гаспадарчай і прафсаюзнай рабоце. Падтрымліваў сувязь з Крычаўскім краязнаўчым музеем і яго дырэктарам М. Мельнікавым. У прыватнасці, пра тое сведчаць асабістыя фотакарткі Івана Пракоповіча, віншавальныя паштоўкі і тэлеграма, у якой ён віншаваў землякоў з 25-й гадавінай вызвалення Беларусі ад нямецка-фашысцкіх захопнікаў. Гэтыя матэрыялы захоўваюцца ў фондах цяперашняга Крычаўскага гістарычнага музея.

Памёр Іван Пракопавіч Гаманкоў 8 лістапада 1980 года. Пахаваны на Міцінскіх могілках, Пятніцкая шаша, 6-ы кіламетр.

Вось так, на жаль, гісторыя не аднесла яго чамусці да ўраджэнцаў нашых мясцін. А ў выніку Крычаўшчына і Магілёўшчына ў цэлым не далічылася аднаго са славутых сваіх герояў.

**Цітоў, К. Двойчы загінуўшы / Канстанцін Цітоў // Крычаўскае жыццё. — 2014. — 19 лютага. — С. 4 : фота.**